■ У бацькоўскі нататнік

# ЦІ ТРЭБА ПРЫМУШАЦЬ ДЗЯЛІЦЦА,

## або Як не выхаваць скнару?

**З маленькай суседкай Маргарытай мы з сынам сустрэліся на дзіцячай пляцоўцы. Даня стрымгалоў пабег капаць пясок, хуценька набраў поўнае вядзерца і, ледзь падняўшы, сабраўся яго некуды несці. У гэты момант да яго спрытна падбегла Марго. Папярэджу, што абаім малым было каля двух гадоў, таму выразна сказаць, чаго хоча кожны з іх, яны яшчэ не маглі. Але ж дзяўчынка дала зразумець, што ёй патрэбна Даніна вядро і, не дачакаўшыся згоды сына, пачала вырываць яго з рук...**



Гэта яна дарэмна зрабіла, бо для Дані яго вядро і шуфлік — святое, іх ён так проста нікому не дае. Таму шанцаў у Маргарыты не было, і малеча падняла крык на ўвесь двор. Я, натуральна, паспрабавала аднавіць мір паміж дзецьмі. Спачатку растлумачыла Маргарыце, што Даня сам толькі пачаў гуляць і яшчэ не гатовы аддаць ёй цацку. Не атрымалася. Малая ўчапілася ў вядро і крычала яшчэ мацней. Тут падаў голас і сын. Тады я прапанавала дзецям кампраміс: «Памяняйцеся вёдрамі. Марго, дай Дані сваё, а ты атрымаеш узамен яго». Але ў Марго вядра не аказалася. Шчыра кажучы, у яе ўвогуле не было з сабою цацак. Нарэшце з'явілася маці нашай суседачкі і, ацаніўшы сітуацыю, адным махам вынесла вердыкт: «Ну ты, Даня, і сквапны! Табе што, вядра шкада?» У мяне аж мову адняло ад такой несправядлівасці. «Можа, калі б вы бралі свае цацкі на вуліцу, іншых не было б сквапных?!» — абурана сказала ўдагонку я.

Зразумела, гэтая сітуацыя не прывяла мяне да думкі, што сын — скнара, абвінавачванне не мела падставы. Але падобныя канфлікты я назірала штодзённа. Звычайна, набавіўшыся са сваімі цацкамі, дзеці пераключаюцца на чужыя. А іх уладальнікі часцей за ўсё рэагуюць раўніва, могуць нават уступіць у бой, бо не жадаюць дзяліцца.

З нашымі пастаяннымі сябрамі і з іх мамамі мы знайшлі выйсце: абавязкова бяром на вуліцу аднолькавы набор цацак — шуфлікі вялікі і малы, мяч, трактар, формачкі і інш. Усе яны, зразумела, трошачкі адрозніваюцца, таму дзецям цікава мяняцца, і канфліктаў удаецца пазбегнуць.

Але бывае, што малы ўсё ж не хоча даваць сваё пагуляць. Ад гэтага многія мамачкі маюць супярэчлівыя пачуцці і бянтэжацца. Упрошваць аддаць, каб тваё дзіця не лічылі скнарай? Ці паважаць права дзіцяці самому распараджацца сваёй маёмасцю? А ці не будзе ў яго з-за такой незгаворлівасці потым цяжкасцяў у дзіцячым калектыве? Ахопліваюць сумненні. Давайце разбірацца.

***P.S.*** *Шчыра кажучы, можа, і я напачатку допускала пэўныя памылкі, іншы раз упрошвала сына даць камусьці машынку пагуляць. Але не так даўно ён сапраўды ўразіў мяне сваім учынкам. Мы збіраліся на дзень нараджэння стрыечнай сястры Дані. Загадзя разам з сынам старанна выбралі і купілі падарунак. І раптам перад выхадам з дому Даня спытаў, ці можна яму падараваць сваёй сястрычцы ўласную цацку. Мы нагадалі, што купілі прыгожы падарунак і гэтага будзе дастаткова. Але Даня нібы не пачуў, усё бегаў з пакоя ў пакой, шукаў нешта. Калі мы ўжо ўручылі падарунак імянінніцы, сын нечакана выняў з кішэні зялёны пластмасы бранзалет і трапятліва працягнуў малой. Мы з мужам здзівіліся, бо добра ведалі, што гэта за рэч. З гэтым бранзалетам Даня ніколі не расставаўся, нават у ложак з сабою браў, прыдумляў з ім новыя гульні і вельмі перажываў, калі ён губляўся. Мы нават не разумелі, чаму ён такі дарагі малому. Але ж дзеці часта маюць прыхільнасць да, як здаецца нам, дарослым, зусім звычайных рэчаў. Імянінніца, зразумела, не выказала бурных уражанняў накошт даволі простага падарунка, але мы заўважылі, што Даня застаўся вельмі задаволены.*

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

### ПАРАДЫ МАМАМ І ТАТАМ

**1.** Псіхолагі сцвярджаюць цікавую рэч: калі хочаш выхаваць сапраўднага скнару — прымушай яго быць шчодрым. Тыя, каго ў дзяцінстве бясконца прымушалі аддаваць сваё, вырастаюць або няўпэўненымі людзьмі, якія не могуць сказаць «не» і ад гэтага пакутуюць, або становяцца занадта скупымі.

Справа ў тым, што ў 2-3 гады фарміруецца дзіцячае «я», пачуццё ўласнасці. І сваю маёмасць, у тым ліку і цацкі, малеча ўспрымае як частку самога сябе. А калі нехта квапіцца на любімае пластмасавае вядзерца, паказвае нязгоду, абараняе «сваё». І мае на гэта поўнае права. Таму ні ў якім разе не трэба настойваць, каб дзіця дзялілася супраць свайго жадання. Яно нават не зразумее, чаму павінна аддаць сваё, навошта? Калі наспявае канфлікт, прапануйце дзецям абмяняцца цацкамі, парайце пагуляць разам або пераключыце іх увагу на нешта іншае. Не дапамагло? Сыдзіце на іншую пляцоўку і пасля таго, як малы супакоіцца, абмяркуйце з ім гэтую сітуацыю.

**2.** Некаторыя мамы баяцца, што староннія будуць лічыць яе дзіця прагным, асудзяць выхаванне. І здольны нават забраць цацку ў свайго і аддаць чужому. Яшчэ і прысаромяць, насварацца. Ваш малы зразумее гэта як здраду, а не ўрок дабрыні. Такая самаахвярнасць нікому не на карысць. Адстойвайце інтарэсы свайго дзіцяці. «Можа, усё ж такі дасі Волечцы шуфлік пагуляць, не назаўсёды?» — зрабіце спробу пераканаць малое. Калі ўсё роўна «не», растлумачце дзяўчынцы, што ваша Таня пакуль сама хоча пагуляць, а пасля, можа, і ёй дасць.

Просты прыклад: уявіце сабе, што нехта на вуліцы раптам просіць даць яму пагуляць з вашым тэлефонам або пракаціцца на вашай машыне. Вядома, нас, дарослых, такая просьба здзівіць, і мы адмовім. Дык чаму ж дзеці павінны так лёгка аддаваць уласную маёмасць?

Чакайце моманту, калі малы пачне дзяліцца свядома. Не прыспешвайце. Жаданне павінна прыйсці па загадзе душы, а не пад ціскам.

**3.** Калі дзіця вельмі беражліва ставіцца да цацак і з-за гэтага не хоча дзяліцца, не бярыце на вуліцу вельмі дарагія яму рэчы. Каб пазбегнуць канфліктаў з дзецьмі, якія прыйдуць да вас у госці, схавайце найбольш любімыя і пакіньце тыя, з якімі сын ці дачка з лёгкасцю дадуць пагуляць.

У дзіцячы садок браць цацкі можна толькі ў тым выпадку, калі даваць з імі гуляць усім дзецям. Хваліцеся, што тыя пашкодзяць рэч, тады лепш пакіньце яе дома.

**4.** Ва ўзросце 3-5 гадоў дзеці ўжо ўмеюць дзяліцца, бо разумеюць: разам гуляць больш цікава, чым паасобку; з тым, хто дзеліцца, будуць сябраваць, а са сквапным — не. Яны з задавальненнем абменьваюцца цацкамі. Але ж навучыць дзяцей дзяліцца павінны бацькі. Лепш за ўсё зрабіць гэта на ўласным прыкладзе. Няхай малыя бачаць, як у сям'і рыхтуюць падарункі адно для аднаго і колькі гэта прыносіць радасці; што пэўныя рэчы, адзежу, якая ўжо малая, можна аддаць таму, хто ў гэтым мае патрэбу; а тату, які хутка вернецца з працы, трэба таксама пакінуць кавалачак торта.

Паглядзіце мульцікі або пачытайце казкі, дзе шчодрыя героі атрымліваюць падзяку, а скнары пасаромлены.

Вядома, што бацькі, бабулі-дзядулі імкнуцца аддаць усё самае лепшае дзецям. Не намагайцеся адмаўляцца ад усяго на карысць свайго дзіцяці, вы перашкаджаеце развіццю шчодрасці і ў выніку выхаваеце эгаіста.

**5.** Калі дзіця хавае свой мячык за спінай, а чужы трактар бярэ без дазволу, растлумачце, што гэта несумленна.

**6.** Хваліце дзяцей, калі яны з кімсьці падзяліліся або дапамаглі іншаму.

**7.** Каб пазбегнуць канфліктаў паміж братамі-сёстрамі, арганізуйце для кожнага дзіцяці ўласны куток: палічку, тумбачку, шафу, дзе будуць захоўвацца яго рэчы. Акрамя агульных цацак, у кожнага павінны быць свае. Растлумачце, што нельга браць ляльку сястры без дазволу і наадварот. Навучыце ветліва прасіць. Каб не выклікаць рэўнасць да брата-сястры (а гэта таксама можа стаць прычынай прагавітасці), у роўнай ступені праяўляйце да дзяцей увагу і пяшчоту.

Калі дзіця зразумее, што ёсць «маё», ён прызнае права маёмасці і іншага.

■ Займальнае чытанне

# ШКОЛА ДОБРЫХ ЧАРАДЗЕЯЎ

**Хто такі сапраўдны чараўнік і як ім стаць, на беларускамоўным уроку пазакласнага чытання «Школа добрых чарадзеяў» высвятлялі вучні 4 «А» класа сярэдняй школы №189 г. Мінска.**

Пяць нефармальных міні-заняткаў у межах праекта «Ад культуры чытання — да культуры асобы» правяла студэнтка 3-га курса факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Ганна Баранава. Запрошаны ў «Школу добрых чарадзеяў» **старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, пісьменнік і паэт Міхась ПАЗНЯКОЎ** з задавальненнем слухаў, як на «Уроку сямейнай цеплыні» дзеці складалі пераблытаныя літаратурныя радкі ў яго вершы, чыталі іх на памяць, адгадвалі загадкі. Гулялі ў літаратурнае фоталато на «Уроку адчування прыгажосці прыроды», падбіраючы пад малюнак адпаведны верш. І нават здавалі творчы экзамен, разважаючы, пра што хацеў сказаць у сваіх творах Міхась Пазнякоў.

*— Вы — мае настаўнікі, бо я вучуся ў вас пісаць сапраўднае і патрэбнае вам. Каб кніга была цікавай, трэба сапраўды быць чараўніком, — сказаў літаратар вучням. — У адной з кніг, якія вы прачытаеце, абавязкова адночы знойдзеце залатыя ключык, схаваны між старонак. Вы адразу зразумееце, калі гэта адбудзецца, бо ён зазвініць галасамі людзей, якія будуць вас хваліць за кемлівасць, спагаду, выхаванне і дабрыню.*



**Вучні падарылі пісьменніку букеты папяровых рамонкаў, на пялёстках якіх напісалі назвы ўпадабаных імі твораў. Ды і сам Міхась Пазнякоў завітаў на ўрок не з пустымі рукамі.**

*— Скіравалі ўвагу на дзіцячую кнігу, бо менавіта ў малодшым школьным узросце пачынаецца фарміраванне сапраўднага паўнавартаснага чытача. Калі страціць гэты перыяд, то пазней цікавасць да чытання можа ўвогуле не з'явіцца,* — лічыць **Наталля ЖДАНОВІЧ, дэкан факультэта пачатковай адукацыі БДПУ**.

*— Мы таксама маем на мэце навучыць будучых настаўнікаў нестандартна ставіцца да ўрока літаратурнага чытання. Хочам, каб яны выйшлі за межы падручніка і прывілі дзецям любоў да кнігі, навучылі,* — патлумачыла сутнасць ідэі **Ірына БУТОРЫНА, старшы выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ, метадыст аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі**. *— Хочацца, каб на гэтых уроках больш глыбока асэнсоўваліся творы дзіцячай літаратуры, каб малым захацелася схадзіць у бібліятэку, прачытаць новае апавяданне, казку.*



**Заданні настаўніка абмяркоўваліся ў групах, так што незвычайны ўрокператварыўся ў сапраўдныя спаборніцтвы, быццам у гульні «Брэйн рынг».**

У межах праекта будучыя настаўнікі праводзяць творчыя ўрокі пазакласнага чытання ў розных школах сталіцы (кожны раз запрашаючы на іх аднаго з дзіцячых пісьменнікаў), а на канікулах — у летніках. У той жа час самі студэнты атрымліваюць майстар-класы ад беларускіх пісьменнікаў і педагогаў з вопытам. Адным з практычных вынікаў працы стане стварэнне метадычных дапаможнікаў, якія стануць карыснай падтрымкай для настаўнікаў.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*